УДК 94(075.8)
ББК 63.3я73
Б142

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ *Л. А. Козік;*
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны РІВШ *С. В. Паноў*

Пад навуковай рэдакцыяй *А. В. Касовіча*

**Багдановіч, І. І.**
Б142 Методыка навучання гісторыі ў школе ў апісаннях, схемах і табліцах : вучэбна-метадычны дапаможнік / І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк ; пад навук. рэд. А. В. Касовіча. – Мінск : БДПУ, 2017. – 20[illegible] с.
ISBN 978-985-541-392-0.

Дапаможнік грунтуецца на кароткіх апісаннях, лагічных схемах і тэкставых табліцах, якія паслядоўна раскрываюць асноўныя праблемы зместу курса методыкі выкладання гісторыі ў сучаснай школе. Утрымлівае кампаненты, неабходныя для арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і фарміравання ў іх прафесійных кампетэнцый настаўніка гісторыі: прыведзены прыкладны план вывучэння кожнай тэмы, грунтоўны спіс навукова-метадычнай літаратуры і блок самакантролю вынікаў засваення, які складаецца з пытанняў і заданняў і тэставых заданняў па асноўных раздзелах курса методыкі выкладання гісторыі.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкам ВНУ і каледжаў, настаўнікам і ўсім, хто цікавіцца методыкай навучання гісторыі.

**УДК 94(075.8)**
**ББК 63.3я73**

**ISBN 978-985-541-392-0**

© Багдановіч І. І., Корзюк А. А., 2017
© Афармленне. БДПУ, 2017

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

***І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк***

# МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ Ў АПІСАННЯХ, СХЕМАХ І ТАБЛІЦАХ

Рэкамендаваны вучэбна-метадычным аб'яднаннем па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны,
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура,
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Мінск
БДПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неабходна ўлічваць пры арганізацыі праблемнага выкладу ? 10. Якія патрабаванні да вуснай мовы неабходна ўлічваць пры выкарыстанні вуснага слова на ўроках гісторыі?

## ТЭМА 8.4. ПРЫЁМЫ ПРАЦЫ З ДРУКАВАНЫМІ СРОДКАМІ НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ

### План вывучэння тэмы

1. Характарыстыка друкаваных сродкаў навучання гісторыі.
2. Роля падручніка ў навучанні гісторыі і методыка работы з ім.
3. Выкарыстанне гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі.
4. Методыка выкарыстання навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры ў навучанні гісторыі.

### Кароткае апісанне асноўнага зместу тэмы

1. У рашэнні адукацыйна-выхаваўчых задач навучання гісторыі, развіцці пазнавальных здольнасцей вучняў значнае месца належыць друкаваным сродкам навучання. Друкаванае слова можа выконваць усе тыя ж функцыі, што і вуснае (апавядальна-апісальную, лагічную, выхаваўчую і арганізацыйную), але яно менш разнастайнае па эмацыянальнай афарбоўцы. Друкаваныя крыніцы даюць магчымасць у любы час звярнуцца да іх, перачытаць, паразважаць над прачытаным. Друкаванае слова ў выкладанні гісторыі прадстаўлена разнастайнымі сродкамі навучання. Гэта падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, хрэстаматыі, кнігі для чытання, навукова-папулярная і мастацкая літаратура, перыядычны друк.

2. Падручнік – гэта найважнейшы сярод друкаваных крыніц ведаў сродак навучання. У адрозненні ад іншых друкаваных крыніц ён змяшчае сістэму ведаў па пэўным курсе гісторыі. Для раскрыцця гэтай сістэмы ў падручніку выкарыстоўваецца слова, вобраз і ўмоўны знак у іх арганічным спалучэнні. Для школьнікаў падручнік – першая і асноўная, а часам і адзіная навукова-папулярная кніга па гісторыі (бо многія вучні, акрамя падручніка гісторыі, нічога ў гэтай галіне ведаў не чытаюць).



Падручнік гісторыі складаецца з шэрагу кампанентаў: тэксту (асноўны, дадатковы, паясняльны) і пазатэкставых кампанентаў: апарату арганізацыі засваення (сістэма пытанняў і заданняў, памяткі) і апарату арыенціроўкі (навукова-пазнавальныя ілюстрацыі, карты, схемы, табліцы, слоўнікі тэрмінаў і ўказальнікі). У практыцы работы школы вызначылася вялікае мноства прыёмаў работы з падручнікам, што сведчыць аб яго значным месцы ў арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці школьнікаў.

3. Выкарыстанне гістарычных дакументаў пры навучанні гісторыі ажыццяўляецца з мэтай: азнаямлення вучняў з першакрыніцамі як гістарычнымі помнікамі і як крыніцамі гістарычных ведаў; прыцягнення ўвагі вучняў да гістарычнага факта, павышэння эмацыянальнасці яго засваення; выпрацоўкі ў школьнікаў самастойнага навуковага падыходу да крыніц гістарычных ведаў, фарміравання такіх прыёмаў работы з імі, як аналіз, сінтэз, абагульненне, параўнанне гістарычных падзей і з'яў і г. д.

Магчымы два спосабы выкарыстання гістарычных дакументаў у навучанні гісторыі: уключэнне гістарычнага дакумента ў выклад настаўніка і арганізацыя самастойнай работы вучняў над тэкстам дакумента або яго аналіз і абагульненне.

Гістарычны дакумент выкарыстоўваецца таксама з мэтай узмацнення доказнасці і пераканаўчасці вуснага выкладу настаўніка на ўроку, падцвярджэння даваемых ім характарыстык і высноў. У такім выпадку неабходна спасылка на цытуемы дакумент і кароткая яго характарыстыка. Кароткі аналіз прыведзенага гістарычнага дакумента надае выкладанню настаўніка аргументаваны характар. У залежнасці ад зместу гістарычнага дакумента, ад падрыхтаванасці класа кароткі разбор дакумента можа спалучацца з аналітыка-сінтэтычнай гутаркай. У такім выпадку пытанні, пастаўленыя да дакумента перад яго разборам, набываюць характар пастаноўкі праблемы.

У практыцы работы настаўнікаў склалася мноства прыёмаў работы з дакументаў. Найбольш распаўсюджанымі з іх з'яўляюцца наступныя: цытаванне для падцвярджэння думкі і цытаванне з наступным тлумачэннем зместу цытаты, каменціраванае чытанне дакумента, выбарачнае яго чытанне па заданні настаўніка, аналіз дакумента па пытаннях настаўніка, аналіз дакумента і складанне простага або



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ